УДК 373.31

# ВЫКАРЫСТАННЕ ПРЫЁМАЎ КАЗКАТЭРАПІІ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ТВОРЧАСЦІ ЗМІТРАКА БЯДУЛІ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ Ў ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЕ

**Лазарчык Надзея Валянцінаўна**
выкладчык Ваўкавыскага каледжа ўстановы адукацыі
"Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы"
г. Ваўкавыск, Рэспубліка Беларусь

**Анатацыя.** У дадзеным артыкуле разглядаецца пытанне выкарыстання прыёмаў казкатэрапіі пры вывучэнні твораў Змітрака Бядулі ў пачатковай школе. Прапануюцца прадуктыўныя прыёмы дадзенай сучаснай тэхналогіі, абгрунтоўваецца мэтазгоднасць іх выкарыстання.

У 2021 годзе адзначаецца 135-годдзе з дня нараджэння аднаго з класікаў беларускай літаратуры – Змітрака Бядулі. Нягледзячы на такую сур'ёзную дату, яго творы вывучаюцца ў пачатковай школе, бо не страчваюць сваёй актуальнасці, багатага адукацыйнага, развіццёвага і выхаваўчага патэнцыялу. Таму мэта дадзенага даследавання – прадэманстраваць асаблівасці прымянення прыёмаў казкатэрапіі пры вывучэнні твораў Змітрака Бядулі для навучэнцаў пачатковай школы. Аб'ект даследавання – вывучэнне творчасці аўтара, прадмет – выкарыстанне прыёмаў казкатэрапіі пры вывучэнні твораў пісьменніка.

У 1–4 класах агульнаадукацыйнай школы вывучаюцца наступныя творы Бядулі: верш "Гаспадарка" – у 2-м класе, казка "Скарб" – у 3-м класе (пазакласнае чытанне), вершы "Сняжыначкі-пушыначкі", "Дудачка" – 4-м класе (пазакласнае чытанне). Гэта творы казачнага зместу. Пры рабоце з імі мы прапануем выкарыстоўваць казкатэрапію, якая з'яўляецца эфектыўнай формай выхаваўчай работы, паколькі заснавана на ўтварэнні сувязей паміж казачнымі падзеямі і паводзінамі звычайнага жыцця, пераносе казачных сэнсаў у рэальнасць. У працэсе работы з казкамі выкарыстоўваюцца разнастайныя казкатэрапеўтычныя прыёмы. "Казкатэрапія – гэта адзін з старажытных метадаў выхавання дзіцяці, ён эфектыўна выкарыстоўваецца ў дзіцячай псіхалогіі. Заняткі казкатэрапіяй накіраваны на развіццё ўнутранага свету дзіцяці, узбагачэнне ўяўлення, дзіця пераадольвае бар'еры ў зносінах, узрастае ўпэўненасць у сабе. Развіваецца сістэма самакантролю і ўзрастае самаацэнка. Казкі вучаць жыццю дзетак" [1].



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Пры разглядзе казкі “Скарб” можна арганізаваць урок у форме падарожжа да хохліка, што дапаможа абудзіць фантазію дзяцей, дазволіць ім лепш зразумець фантастычны свет казкі. Прадуктыўным будзе расказванне гэтай казкі настаўнікам, што актывізуе ўвагу навучэнцаў, дапаможа ўявіць створаную ў казцы рэальнасць.

Цікавым з’яўляецца заданне прадэманстраваць ілюстрацыі прадстаўнікоў беларускай фаўны, згаданых у творы, і назваць іх: светлячок, цвыркун, жаба, плотка, варона, драч, зязюля, дзяцел, камар. А потым праз прыём творчай гульні з казачнымі персанажамі растлумачыць, якую карысць прыносяць гэтыя істоты. Тут назіраецца сувязь з дысцыплінай “Чалавек і свет”, актуалізуецца і паглыбляецца пазнавальная сфера навучэнцаў.

Можна таксама прапанаваць прыём перапісвання казкі: уявіць сітуацыю, калі б Саўку давялося надоўга застацца жыць у хохліка, або ўявіць, што навучэнец апынуўся ва ўладаннях гэтых стварэнняў. Такія прыёмы актывізуюць творчыя здольнасці дзяцей.

Верш Змітрака Бядулі “Сняжынкі” – чароўная казка пра зіму. Пры рабоце з ім мэтазгодна выкарыстаць такі прыём, як параўнанне твораў розных відаў мастацтва: верша “Сняжынкі” Змітрака Бядулі і, напрыклад, карціны “Першы снег” Андрэя Баравіка. Пры гэтым неабходна спытаць у навучэнцаў: “Чым падобныя гэтыя творы? Які настрой перадае кожны з іх? Каго ці што нагадваюць сняжынкі ў кожным з твораў?” Такі прыём стварае ўмовы для актуалізацыі аналітычных уменняў дзяцей.

Мэтазгодна прапанаваць навучэнцам зрабіць ілюстрацыі да верша, гэта заданне таксама паяднае розныя віды мастацтва і дасць магчымасць дзецям праявіць сябе творцамі.

Твор “Гаспадарка” апавядае вучням пра працавітых жывёл. Цікавым заданнем пры вывучэнні гэтага твора будзе яго інсцэніроўка: навучэнцы самі могуць выступаць у якасці дзеючых персанажаў або выкарыстоўваць цацкі. Такі від дзейнасці павышае пазнавальную матывацыю школьнікаў, абуджае іх творчасць.

Пасля знаёмства з вершам можна прапанаваць вучням інтэлектуальную гульню “Хованкі” з удзелам герояў верша. Пры гэтым дзецям неабходна адгадаць па апісанні дзеючых асоб верша. Напрыклад:

– Сапраўдны сябар чалавека, вартаўнік дома – гэта… (сабака);

– Барадаты, рагаты і патрэбны ў хатняй справе… (козлік).

– Гэты лясны жыхар спіць да вясны, яму не страшныя ніякія марозы, вельмі любіць мёд… (мядзведзь.).

– Лясная рыжая хітрунря… (ліса).



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

– Мяккія лапкі, на лапках царапкі… (кот).
– Маленькі Пік у норцы знік… (мыш).
– Сядзіць у куточку і тчэ сарочку… (павук).
– Лясны лекар… (дзяцел).

Такая інтэлектуальная гульня з казкай дапаможа актывізаваць пазнавальную сферу дзяцей.

Прапанова выбраць найбольш цікавага персанажа і зрабіць яго малюнак, растлумачыўшы свой выбар, прадэманструе сувязь розных відаў мастацтва і падштурхне дзяцей да творчасці. Такі прыём, як складанне кадраплана да верша-казкі, дапаможа выдзеліць структурныя часткі твора і праілюстраваць яго.

Пры вывучэнні верша казачнага зместу “Дудачка” эфектыўным заданнем будзе прыдумванне чарадзейнай казкі пра магічную сілу выбранага вучнямі музычнага інструмента.

Такім чынам, пры вывучэнні творчасці Змітрака Бядулі ў пачатковай школе можна выкарыстоўваць разнастайныя прыёмы казкатэрапіі: маляванне, складанне кадраплана, інтэлектуальныя гульні, расказванне казак, перапісванне казак, драматызацыя, творчыя гульні з казкай, сачыненне казак. Усе яны скіраваны на рэалізацыю адукацыйных, развіццёвых, выхаваўчых задач урока і дапамагаюць фарміраванню творчай, актыўнай, самастойнай асобы дзіцяці.

## Спіс літаратуры

1. Казкатэрапія // Сайт установы адукацыі “Дзяржаўны санаторны яслі-сад №367 для дзяцей з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі” [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://ddu367.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=24221. – Дата доступу : 12.01.2021.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова